# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА «Рух «За Свабоду» Выпуск №4 кастрычнік 2014 году



«Карусель пікетаў» – стар. 3

Рэзерв для Руху - стар. 6-7

Супольная дзейнасць з Блокам Парашэнкі - стар.8


## Незалежнік і праеўрапеец



**Такім павінен быць, на перакананне Руху «За Свабоду», адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў падчас выбарчай прэзідэнцкай кампаніі-2015.**

Лідар Руху арганізацыі Аляксандр Мілінкевіч абазначыў гэтую пазіцыю ў прывітальным слове, з якім ён выступіў 11 кастрычніка ў Мінску на з'ездзе партнёрскай Партыі БНФ.

Па словах Мілінкевіча, вельмі важна, каб у грамадстве былі такія сілы, «якія думаюць не толькі пра пасады і кар'еры, а перш за ўсё дбаюць пра нацыянальныя каштоўнасці і Бацькаўшчыну».

«Для мяне адзіны кандыдат ад апазіцыі, калі ён будзе абраны, - гэта толькі інструмент. Надзвычай неабходна, каб гэты чалавек адстойваў нацыянальна-дэмакратычныя інтарэсы, каб быў беларусам, праеўрапейцам. І каб гэты чалавек не здрадзіў», - сказаў Мілінкевіч.

Бо важна, па словах старшыні Руху «За Свабоду», што будзе казаць гэты чалавек: «Таму што адзіны можа загаварыць, што спачатку трэба інтэгравацца з Расіяй, а потым – з Еўропай, што Расія мае тут інтарэс. І паколькі яна кантралюе нашу эканоміку, то хай прыватызуе яе…»

«Таму на нас з вамі вялікая адказнасць за тое, што будзе казаць і шчыра адстойваць адзіны кандыдат. Ён мусіць перадусім адстойваць незалежнасць. У выбарчай кампаніі-2015 слова "незалежнасць" мусіць быць ключавым». – заявіў Аляксандр Мілінкевіч у прывітальнай прамове да дэлегатаў з'езда Партыі БНФ.

На ім, дарэчы, была задэкларавана падтрымка на прэзідэнцкіх выбарах-2015 кандыдатуры Аляксандра Мілінкевіча

Перад гэтым праводзілася адмысловае рэйтынгавае галасаванне, і большасць дэлегатаў з'езда выказаліся за тое, каб падтрымаць у якасці адзінага кандыдата ў прэзідэнты на выбарах 2015 году старшыню Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча.

Вынікі галасавання: Аляксандр Мілінкевіч - 68 галасоў, Мікалай Статкевіч - 21, Алена Анісім - 20, Уладзімер Някляеў - 14, Анатоль Лябедзька - 1.

Нагадаем, адзіны кандыдат ў прэзідэнты ад апазіцыі будзе абраны на Кангрэсе дэмсілаў.

## Іспыт для дэпутатаў

**Кампанія «Народны рэферэндум» 2 кастрычніка, у дзень адкрыцця восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў, пабывала ў парламенце. Парламентарыям былі перададзеныя першыя сабраныя 50 тысяч подпісаў грамадзян Беларусі ў падтрымку пытанняў прапанаванага рэферэндуму.**

У кампаніі, адным з ініцыятарам якой з'яўляецца Рух «За Свабоду», уважаюць гэта за народны іспыт для дэпутатаў: парламент як суб'ект ініцыявання правядзення рэспубліканскіх рэферэндумаў павінен разгледзець гэтую прапанову дзясяткаў тысячаў беларусаў на сваіх пленарных пасяджэннях.

Нагадаем, гэтыя пытанні тычацца адукацыі, аховы здароўя, рэальнага забеспячэння замацаванага ў Канстытуцыі імкнення Рэспублікі Беларусь да нейтралітэту, сапраўды дзейснага і дэмакратычнага мясцовага самакіравання,


**працяг на стар. 2**

# Іспыт для дэпутатаў (працяг)

працяг са стар. 1

эканамічнай інтэграцыі з Еўрасаюзам і механізму прыватызацыі.

Актывісты «Народнага рэферэндуму», які ініцыявалі, апрача Руху «За Свабоду», кампанія «Гавары праўду», Партыя БНФ і падтрымалі БСДП (Грамада) і аргкамітэт па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу, пазнаёмілі з ідэяй рэферэндуму прыблізна 230 тысяч грамадзян.

50 тысяч беларусаў паставілі свае подпісы ў падтрымку парадку дня «Народнага рэферэндуму».

«Подпісы суправаджае ліст да кожнага парламентарыя. Мы заклікаем іх скарыстацца законнымі паўнамоцтвамі дэпутата Палаты прадстаўнікоў, каб голас грамадзянаў, якія падтрымалі ініцыятыву правядзення рэспубліканскага рэферэндуму, быў пачуты заканадаўчым органам улады», - падкрэсліваюць «рэферэндумцы».

Прадстаўнікі кампаніі ўжо сустрэліся з дзясяткам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і прэзентавалі ім рэферэндумную ініцыятыву, падтрыманую ў тым ліку і іхнімі выбарцамі.

Цягам восеньскай сесіі ніжняй палаты парламента яны плануюць асабіста сустрэцца з кожным дэпутатам, каб падрабязней распавесці пра сутнасць пытанняў «Народнага рэферэндуму" і высветліць іх рэакцыю на волю народа.




Сабраныя 50 тысяч подпісаў у падтрымку «Народнага рэферэндуму» – толькі пачатак. У кампаніі лічаць, што ўдасца дасягнуць планкі ў паўмільёна сабраных подпісаў, бо відавочна, што беларускі народ хоча пераменаў у краіне.

Паводле вынікаў верасnёўскага апытання НІСЭПД, самым прымальным праектам апазіцыі застаецца якраз «Народны рэферэндум»: калі б яго правядзенне залежыла асабіста ад рэспандэнтаў, то за яго і мірныя перамены выказаліся б 45,2%, супраць – 36%.

## Пошукі смелых

Прадстаўнікі «Народнага рэферэндума» будуць намагацца сустрэцца з кожным з дэпутатаў, каб знайсці хаця б аднаго смелага, які б ініцыяваў разгляд у парламенце пытання пра прызначэнне рэферэндуму, кажа адзін з лідараў кампаніі «Народны рэферэндум», першы намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч.



**Шэсць пытанняў «Народнага рэферэндуму»:**

1. Ці згодныя вы, што ў дзяржаўных установах адукацыі і аховы здароўя ўсе паслугі грамадзянам Беларусі павінны аказвацца бясплатна?
2. Ці згодныя вы, што кіраўнікі выканкамаў гарадоў, раёнаў, абласцей павінны абірацца прамым галасаваннем грамадзян?
3. Ці падтрымліваеце вы курс на эканамічную інтэграцыю, асацыяцыю і стварэнне бязвізавай прасторы з Еўрапейскім Саюзам?
4. Ці згодныя вы, што дзеля забеспячэння нейтральнага статусу Беларусі ў краіне павінна быць забаронена размяшчэнне замежных вайсковых аб'ектаў, ядзернай зброі, а беларускія вайскоўцы не мусяць несці службу за мяжой?
5. Ці згодныя вы, што адна і тая ж асоба не можа займаць пасаду прэзідэнта больш за два тэрміны?
6. Ці згодныя вы, што грошы, атрыманыя ад запланаванай урадам прыватызацыі, у першую чаргу павінны пайсці на кампенсацыю ўкладаў, згубленых пад час дэвальвацыі-2011, і стварэнне працоўных месцаў?

«Мы пастараемся сустрэцца з кожным з іх. Каб знайсці сярод дэпутатаў хаця б аднаго смелага, які б ініцыяваў разгляд у парламенце пытання аб прызначэнні рэферэндуму на гэтай сесіі. Палата прадстаўнікоў не раз у рэкордна хуткія тэрміны прымала патрэбныя рашэнні: імгненна, напрыклад, прагаласавалі да Дамову аб Еўразійскім саюзе, за дзень прымаўся

бюджэт. Мы дадзім ім болей часу здаць іспыт перад народам», - адзначыў ён.

Лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў заўважае, што сёння настроі беларускага грамадства можна акрэсліць коратка – «абы не было вайны!».

«І дзверы баяцца адчыняць. Што прапанаваць у такіх умовах – рэвалюцыю, Плошчу? Быў прапанаваны “Народны рэферэндум" як шлях мірных пераменаў», - заявіў палітык.

Апошнія дадзеныя НІСЭПД, што паказалі прыязнае стаўленне паловы грамадзян Беларусі да ідэі «Народнага рэферэндуму», на думку Някляева, гэта поспех. Працу актывістаў «Народнага рэферэндуму» ён назваў не такой эфектнай, як лозунгі на мітынгах кшталту «У турму!», «У Гаагу!».

«Задача дэмакратычнай апазіцыі - паскараць працэс паступовай, крокам за крокам, эвалюцыі грамадства», - прыводзіць словы Някляева сайт «Народнага рэферэндуму»

Старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч заявіў, што кампанія «Народны рэферэндум» мае стратэгічныя мэты: «Гэта адна з формаў палітычнага дзеяння дзеля перадухілення магчымай расійскай агрэсіі. Гарантам незалежнасці сёння ёсць не Лукашэнка, а грамадства. І трэба паспрыяць, каб яно стала суб’ектам палітычнага жыцця».

Старшыня БСДП (Грамада) Ірына Вештард зазначыла, што ««Народны рэферэндум» дазваляе аб’ядноўваць не толькі палітычныя сілы, але і насельніцтва».

Апрача размоваў з дэпутатамі, запланавана правядзенне далейшых грамадскіх слуханняў, прысвечаных праблематыцы пытанняў «Народнага рэферэндуму». Ужо




адбыліся слуханні па рэформе адукацыі, у верасні-кастрычніку дыскутуюцца пытанні, як зрабіць больш якасная і даступнай медычнае абслугоўванне.

«Прафесійная і даступная медыцына, адукацыя – гэта элементарнае права на годнае цяперашняе і будучае для нас і (галоўнае!) для нашых дзяцей! Дзяржава не мае права рабіць бізнэс на нашым здароўі і абмяжоўваць нашы магчымасці», - лічаць ініцыятары «Народнага рэферэндуму».

Наперадзе – грамадскія слуханні па перспектывах развіцця стасункаў з Еўрасаюзам.

Па выніках слуханняў будуць складацца рэкамендацыі па зменах у той альбо іншай галіне. Гэтыя прапановы будуць перададзеныя кіраўнікам профільных ведамстваў. У прыватнасці, прапановы па рэформе адукацыі ўжо ў адпаведным міністэрстве.

## Выклік на дэбаты

Актывісты «Народнага рэферэндуму» прапанавалі дэпутату Дзмітрыю Шаўцову правесці дэбаты на тэму платнай медыцыны

Актывісты кампаніі «Народны рэферэндум» заклікалі члена пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Дзмітрыя Шаўцова правесці публічныя дэбаты на тэму платнай медыцыны.

Шаўцоў вядомы як «паслядоўны прыхільнік увядзення сістэмы аплаты цяперашніх бясплатных медыцынскіх паслуг», у прыватнасці «ўвядзення платы за наведванне дзяржаўных паліклінік», сказана ў адкрытым звароце да дэпутата, які падпісалі першы намеснік Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч, намеснік кіраўніка грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду»Андрэй Дзмітрыеў і намеснік старшыні Партыі БНФ Ігар Лялькоў.

Аўтары звароту нагадалі, што адно з пытанняў, выпрацаванае ў межах кампаніі «Народны рэферэндум», датычыцца прынцыпу бясплатнай адукацыі і медыцынскіх паслуг, а Шаўцоў з’яўляецца «апанентам такога пункту гледжання».

«Мы лічым, што з вашага боку ў такіх дэбатах маглі б удзельнічаць вы самі, а таксама вашыя памочнікі і іншыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, якія падзяляюць вашу пункт гледжання па праблеме платнасці або бясплатнасці абслугоўвання грамадзян Беларусі ў дзяржаўных медыцынскіх установах», - адзначылі ў сваім звароце лідары кампаніі.

Яны дадалі, што з боку прадстаўнікоў «Народнага рэферэндуму» у дэбатах гатовы ўдзельнічаць у тым ліку «кваліфікаваныя спецыялісты ў галіне медыцыны».

Аўтары адкрытага дакумента пакінулі права выбару фармату і пляцоўкі для дэбатаў за парламентарыем, аднак адзначылі варыянт, што «гэта магла б быць дыскусія ў межах грамадскіх слуханняў па праблемах медыцынскага абслугоўвання,

якія праводзяцца кампаніяйм «Народны рэферэндум» у розных гарадах Беларусі».

«Таксама гэта могуць быць відэадэбаты на партале tut.by, сайце naviny.by, на любым з тэлевізійных каналаў, альбо дыскусія за круглым сталом, матэрыялы якой будуць апублікаваныя ў любым дзяржаўным ці недзяржаўным друкаваным ці інтэрнет-СМІ па вашым выбары, ці якісьці іншы фармат, які вы прапануеце», - падкрэслілі ў кампаніі «Народны рэферэндум».

«Мы глыбока перакананыя, што грамадзяне Беларусі павінны атрымаць магчымасць ацаніць аргументы і контраргументы прыхільнікаў розных падыходаў да такім важным для ўсіх нашых грамадзян пытанні. Гэта дапаможа ім сфармаваць уласны пункт гледжання па гэтай праблеме, што будзе садзейнічаць далейшаму росту іх грамадзянскай самасвядомасці», - падсумавалі аўтары звароту.

## На здароўе!

Ахова здароўя — заўсёды ўгары ТОП-занепакоенасцяў людзей. Таму невыпадкова пытанне пра даступнаць і якасць медычнага абслугоўвання разам з адукацыяй ідзе першым у парадку дня «Народнага рэферэндуму», кажа Юрась Губарэвіч.

Падчас паездак па Беларусі, збіраючы подпісы ў падтрымку яго пытанняў, пра тое, як нас лечаць, даводзілася гаварыць шмат, прыгадвае адзін з лідараў Руху. І на лесвічных пляцоўках у пад'ездах дамоў, і ў дварах, і ў паліклініках. Людзі наракаюць на чэргі і на тое, што да дэфіцытных профільных дактароў не патрапіць тыднямі, а то і месяцамі. Асабліва жыхарам сельскай мясцовасці. Народ сумна жартуе: як пашанцуе, дажывеш да прыёма ўрача — маеш шанец атрымаць лячэнне і адужаць.



Губарэвіч заўважае, што асноўнай праблемай беларускай медыцыны падчас грамадскіх слуханняў лекары называюць недахоп фінансавання галіны. Рух «За Свабоду» лічыць, што рэформы ў сістэме аховы здароўя трэба пачынаць менавіта з павелічэння памеру фінансавання медыцыны — з цяперашніх 5% да 10% ад узроўню ВУП.

Іншыя нашыя прапановы ўтрымліваюцца ў «Народнай праграме» (prahrama.by):

- Пералічэнне заробкаў супрацоўнікам медыцынскіх установаў да сярэдніх паказчыкаў па эканоміцы краіны;
- Стварэнне роўных умоваў для дзейнасці дзяржаўных і прыватных медыцынскіх установаў;
- Стварэнне сістэмы прыватнай страхавой медыцыны;
- Развіццё медыцынскага турызму;
- Увядзенне нязменнага базавага набору бясплатнай медыцынскай дапамогі асобам да 18 год, пенсіянерам і інвалідам;
- Увядзенне практыкі сямейных дактароў;
- Зніжэнне бюракратычнай нагрузкі на супрацоўнікаў медыцынскіх установаў;
- Увядзенне ў медыцынскіх ВНУ спецыяльнасці «менеджмент сістэмы аховы здароўя".

Асобную ўвагу трэба надаць дэалкагалізацыі: беларусы спажываюць алкаголь, на жаль, па-лідарску. Паводле дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, гэта 17,5 літра на душу насельніцтва ў пераліку на чысты спірт.

Зрэшты, Міністэрства аховы здароўя Беларусі запярэчыла, што лічба завышаная, назваўшы іншы паказчык — 11,14 літра. Нават калі так, то і гэта прыкрае месца ў першай дваццатцы! Аднак афіцыйная статыстыка ў нашай краіне не ўлічвае саматробныя алкагольныя напоі і нелегальна ўвезеныя ў Беларусь.

Сярод мераў па зніжэнні спажывання алкаголю, а таксама тытуню намі прапануюцца:

- Значнае павелічэнне акцызаў на алкаголь і цыгарэты (напрыклад, кошт бутэлькі гарэлкі мусіць быць роўным не меней за мінімальны дзённы заробак);
- Забарона продажу піва і моцнага алкаголю ад 22:00 вечара да 10:00 раніцы;
- Вынас продажу цыгарэт і алкаголю ў спецыялізаваныя крамы і шапікі;
- Поўная забарона рэкламы цыгарэт, піва і моцнага алкаголю ў СМІ і на білбордах, а таксама гандлёвых марак вытворцаў цыгарэт і алкаголю;
- Павелічэнне ўзроставага цэнзу на забарону продажу цыгарэт, піва і моцнага алкаголю асобам да 21 года;
- Забарона вырабніцтва і продажу пладова-ягадных він («чарніла») на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

**P.S. Дасылайце, калі ласка, на info@pyx.by вашыя прапановы па рэфармаванні медыцынскай сферы.**

# «Карусель пікетаў» за Украіну

**Актывістамі Руху «За Свабоду» Арцёмам Лявам і Алесем Марчанкам напачатку верасня ініцыявана шматдзённая акцыя «Карусель пікетаў».**

Яны прапанавалі кожны дзень падаваць заяўкі на пікеты каля амбасады Расіі з патрабаваннем спыніць ваенныя дзеянні ва Украіне. Далучыліся да акцыі і кіраўнікі Руху – першы намеснік і намеснік старшыні арганізацыі Юрась Губарэвіч і Алесь Лагвінец.

Што праўда, з Мінгарвыканаму пакуль прыходзяць адныя адмовы. Часам забаўныя. Чыноўнікі трэніруюць фантазію.

Вось з якой прычыны, напрыклад, была незадаволеная заяўка грамадскай актывісткі Таццяны Грачанікавай. Аказваецца, адзіночны пікет супраць вайны ва Украіне будзе адцягваць увагу кіроўцаў і папсуе зялёныя насаджэнні.

«Пададзеная вамі заява не адпавядае арт. 9 Закона «Аб масавых мерапрыемствах»», - адзначана ў адмове на заяўку аб правядзенні пікета, падпісанай намеснікам старшыні Мінскага гарадского выканаўчага камітэту Ігарам Карпенкам.

У прыватнасці, чыноўнікі лічаць, што правядзенне масавага мерапрыемства «не будзе спрыяць захаванню элементаў добраўпарадкавання і зялёных насаджэнняў, можа ствараць перашкоды пешаходнаму і транспартнаму руху, адцягваць вадзіцелей транспартных сродкаў ад выканання ПДР».

Акрамя таго, дадалі яны, у заяўцы «не пазначаныя канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры прывядзенні масавага мерапрыемства».

«Чыноўнікі праяўляюць фантазію для адмоваў, кажуць абсурдныя рэчы. Атрымліваецца, нельга ні стаяць, ні гуляць, калі нават адзіночны пікет стварае такія сур'ёзныя перашкоды», - 


МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Адамовічу С.Г.
вул. Фрунзе, 36
г.Мар'іна Горка Мінскай вобласці

Аб правядзенні мерапрыемства

У Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце разгледжана Ваша заява аб правядзенні 01.10.2014 з 15.00 да 16.00 на тэрыторыі «пляцоўкі перад Пасольствам Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь не бліжэй 50 метраў ад варот будынка пасольства (у зялёнай зоне)» у г.Мінску масавага мерапрыемства ў форме пікетавання.

Інфармуем Вас аб тым, што пададзеная Вамі заява не адпавядае патрабаванням артыкулаў 5 і 9 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь".

Правядзенне масавага мерапрыемства на тэрыторыі зялёнай зоны, прылеглай да вул. Нававіленскай і Старавіленскі тракт, не будзе спрыяць захаванасці элементаў добраўпарадкавання і зялёных насаджэнняў, можа ствараць перашкоды пешаходнаму і транспартнаму руху, адцягваць вадзіцеляў транспартных сродкаў ад выканання ПДР.

Акрамя таго, у Вашай заяве не вызначаны канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавага мерапрыемства.

Улічваючы вышэйпададзенае, Мінгарвыканкам не дазваляе правядзенне 01.10.2014 з 15.00 да 16.00 пікетавання на тэрыторыі г.Мінска.

Намеснік старшыні І.В.Карпенка

**У капілку абсурдных адмоваў Мінгарвыканкаму**

адзначыў ініцыятар «Каруселі пікетаў» Арцём Лява.

На ягоную думку, у чыноўнікаў ёсць «устаноўка не дазваляць не толькі звязаныя з украінскімі падзеямі акцыі, але і любыя грамадзянскія ініцыятывы».

Сам Лява разам з Марчанкам таксама атрымалі адмоўныя адказы: «Нас з Алесем, паколькі мы ўдзельнічалі ў несанкцыянаваным мерапрыемстве вясной, увогуле пазбавілі права арганізоўваць мітынгі».

У гэта адразу цяжка паверыць. Але у «Законе аб масавых мерапрыемствах» сапраўды напісана, што калі ты быў асуджаны за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве, то год не маеш права арганізоўваць нават адзіночныя пікеты. Гэты закон абмяжоўвае правы прапісанае ў Канстытуцыі ў такой фармулёўцы:

«Асобы, якія допусцілі парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавага мерапрыемства, цягам аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое парушэнне не могуць выступаць арганізатарамі масавага мерапрыемства».

Што там Канстытуцыя! У Беларусі гэтае права абмяжоўваецца яшчэ і рашэннямі выканкамаў. Аказваецца, у 42 гарадах Беларусі ёсць рашэнні выканкамаў, што разам з заяўкай на правядзенне пікета трэба падаваць дамовы з міліцыяй, «хуткай» і камунальшчыкамі. А далей замкнутае кола.

«Міліцыя просіць спачатку дазвол выканкама, а ахова здароўя спасылаецца на тое, што няма магчымасці абслугоўваць такія мерапрыемствы. У Оршы сказалі, што ў рэестры, зацверджаным міністэрствам, няма такой паслугі — абслугоўванне пікетаў і мітынгаў. У Віцебску 5 гадоў не дазвалялі ні адзін пікет і ні адзін мітынг», — сказаў каардынатар Руху "За Свабоду" па Віцебскай вобласці Хрыстафор Жаляпаў у інтэрв'ю «Еўрарадыё».

Нават каб правесці адзіночны пікет, патрэбныя ўсе гэтыя дамовы!

Што да «Каруселі пікетаў», то Алесь Марчанка падкрэсліў: ён асабіста працягне змагацца за магчымасць законна пратэставаць супраць расійскіх дзеянняў ва Украіне: «Я б хацеў каб вайна хутчэй скончылася ва Ўкраіне і буду падаваць заяўкі, пакуль яна не скончыцца»

# Рэзерв для Руху

**Штогадовая школа Руху «За Свабоду», якая сёлета прайшла на Віленшчыне, называлася «Беларуская ідэя і шляхі нацыянальнай кансалідацыі ў Беларусі».**

Удзел у ёй узялі два дзясяткі маладых людзей ад 18 да 30 гадоў і вядомыя беларускія эксперты, грамадскіх дзеячаў і палітыкаў. Лекцыі прачыталі пісьменнік Уладзімір Арлоў, Алесь Смалянчук, Сяргей Чалы, Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Класкоўскі, Валер Булгакаў, Яраслаў Крывой, Генадзь Сагановіч, Таццяна Чуліцкая, Уладзімір Падгол, Рыгор Астапеня, Хведар Нюнька…

Каб патрапіць у Школу, трэба было прайсці конкурс.

Удзельнікі адбору для навучання ў школе павінны былі прадставіць эсэ на тэму «Шляхі нацыянальнай кансалідацыі беларускай нацыі». Канкурсанты падалі разнастайныя варыянты аб'яднання сучасных беларусаў, выказаўшы спадзяванне на тое, што атрымаюць яшчэ больш ведаў пра гэта пад час навучання.

«Чым больш існуе рэчаў, якія нас яднаюць, тым больш упэўнена народ можа называцца народам. Я маю на ўвазе культуру. Сапраўдную, нацыянальную спрадвечную культуру, ды культуру сучасную, і гісторыю нашае нацыі. Нам не хапае каналаў па яе распаўсюду ды прасоўванню, бо ў гэтым зацікаўлена пэўнае лакальнае кола. Трэба шукаць шляхі, каб гэта стала масавай зацікаўленасцю», - напісала, напрыклад, Вераніка Ж. у конкурсным эсэ.



«Я лічу, што кансалідаваць беларускую нацыю можна праз спорт. Што і было паспяхова даказана ў Мінску ў маі 2014 года на мінулым чэмпіянаце свету па хакеі», - лічыць Дзяніс К.

«Кансалідацыя нацыі - цяжкі, доўгі і шматгранны працэс, які, на маю думку, які зараз як раз набірае моцы. Пашырэнне выкарыстоўвання мовы, стварэнне беларускіх ініцыятываў (напрыклад, агучванне фільмаў), рост папулярнасці вышыванак - усё гэта сведкі цікавасці да мінулага і гонару за бацькаўшчыну», - адзначыла Аляксандра К., дадаўшы, што, на яе меркаванне, самы эфектыўны спосаб кансалідацыі нацыі - развіццё мясцовых супольнасцяў, з'яўленне «кропкавых аазісаў беларускасці».




«Для кансалідацыі беларускай нацыі неабходны магутны плацдарм, які патрэбна узяць за аснову. Як я лічу, такой асновай павінна стаць беларуская мова. Мова - гэта тое, што у нас ёсць і чым павінны ганарыцца. Яна у нас вельмі прыгожая, але не вельмі распаўсюджаная. Аднак, сёння ўсё больш людзей пачынаюць актыўна на ёй размаўляць і не цурацца яе», - уважае Андрэй С.

«Мы адбіраем найперш новых людзей, тых, якія раней не былі заангажаваныя ў палітычную і грамадскую дзейнасць, але цікавяцца тэматыкай школы. Увогуле аддаецца перавага новым людзям, якія толькі хацелі б далучыцца, якія цікавяцца дзейнасцю грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. Кожны раз Школы праходзяць з рознай тэматыкай. Была тэма еўрапейскай інтэграцыі Беларусі, была тэма эканамічнай сітуацыі. Сёлета было вырашана акцэнтаваць увагу на нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Натуральна, гэта звязана з палітычнай сітуацыяй у рэгіёне», — тлумачыць першы намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч.

«І мы спадзяемся, што выпускнікі будуць праяўляць большую актыўнасць у грамадскай дзейнасці., - дадае Губарэвіч. - Маем добрыя пры-




клады з папярэдніх школаў, калі выпускнікі прыходзілі ў Рух “За Свабоду“ як валанцёры, дапамагалі праводзіць мерапрыемствы і кампаніі. Некаторыя выпускнікі папярэдніх гадоў сталі кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых саветаў, хаця мы і не агітуем за актыўнае далучэнне да палітычнай дзейнасці».

Перад удзельнікамі Школы, апрача Губарэвіча, выступілі таксама старшыня Руху Аляксандр Мілінкевіч і намеснік кіраўніка арганізацыі, дырэктар Школы Алесь Лагвінец.

«Сёння еўрапейскія палітыкі без сумневаў называюць Беларусь еўрапейскай краінай. Але чаму мы так далёка ад Еўропы?» – паразважаў у сваім выступе Аляксандр Мілінкевіч.

«Наша праблема - вынішчэнне беларускай эліты. Беларус згубіў арыентацыю», - працягнуў палітык, згадаўшы злачынствы за савецкім часам, дэнацыяналізацыю і русіфікацыю. «Я так шмат кажу аб нацыянальнай свядомасці, бо, каб ісці ў Еўропу, нам патрэбна Адраджэнне», - адзначыў Мілінкевіч.

Юрась Губарэвіч з аптымізмам прывёў вынікі сацыялагічных апытанняў, якія паказваюць высокую сімпатыю беларусаў да Еўрасаюзу: «Такая колькасць людзей, што хочуць руху ў бок Еўропы, ідзе на карысць не літоўскага “Акропалісу", але еўрапейскіх каштоўнасцей».

Па словах першага намесніка старшыні Руху «За Свабоду», «існуе вялізны патэнцыял еўрапейскай опцы ў Беларусі, хоць, зразумела, ён не такі высокі, як ва Украіне».

Кіраўнікі Руху «За Свабоду» пазнаёмілі маладых слухачоў Школы з дзейнасцю арганізацыі, распавёўшы пра розныя ініцыятывы і кампаніі. У прыватнасці, была прэзентавана кампанія «Народны рэферэндум».

Ад удзельнікаў Школы прагучала пытанне пра тое, чаму ў парадку дня «Народнага рэферэндуму» няма пытання аб вяртанні бел-чырвона-белага сцяга.

«Пытанне нацыянальных сімвалаў - напэўна, не зусім справа палітыкаў. Ёсць шмат людзей і арганізацый, якія робяць гэта лепш, чымсьці мы", - адказаў Юрась Губарэвіч, прывёўшы ў якасці прыкладу грамадскую кампанію «Будзьма беларусамі!» і гурт «Ляпіс Трубяцкой».



## Фотафакт

Пры канцы верасня ў адной з аграсядзібаў пад Мінскам адбылося пасяджэнне Рады Руху «За Свабоду». Былі абмеркаваныя пытанні дзейнасці арганізацыі, у тым ліку звязаныя з прэзідэнцкімі выбарамі-2015.

Як можна бачыць на фота, рухаўцы радзіліся ў нязмушанай атмасферы.



# Супольная дзейнасць з блокам Парашэнкі

**Лідары Руху «За Свабоду», старшыня арганізацыі Аляксандр Мілінкевіч і першы наместнік старшыні Юрась Губарэвіч, 15 верасня наведалі Кіеў, дзе сустрэліся з кіраўніцтвам асноўных палітычных сілаў Украіны.**



У прыватнасці, адбыліся сустрэчы, з кіраўніком Блока Пятра Парашэнкі Юрыем Луцэнкам, дарадцам прэзідэнта Украіны, дэпутатам фракцыі партыі «УДАР» у Вярхоўнай Радзе Расціславам Паўленкам, а таксама наместнікам кіраўніка фракцыі Усеўкраінскага аб'яднання «Батькивщина» Барысам Тарасюком.

«Падзеі ва Украіне істотна ўплываюць на беларускае грамадства», - сказаў Рух.by Юрась Губарэвіч.

Па ягоных словах, «важна наладжваць у тым ліку асабістыя каналы стасункаў з вядомымі ўкраінскімі палітыкамі. І дзеля шматсфернай супрацы ў перспектыве, і каб мець інфармацыю з першых вуснаў пра тое, што адбываецца ва Украіне цяпер».

«Была абмеркавана няпростая сітуацыя ў нашай паўднёвай краіне-суседцы, - паведаміў Аляксандр Мілінкевіч, – і тое, як бараніцца нам разам ад неаімперскай расійскай агрэсіі. У тым ліку ад плыняў крамлёўскай прапаганды ў інфармацыйнай прасторы».

Ён падкрэсліў, што «нашы пазіцыі супадаюць і што тычыцца неабходнасці салідарных пазіцый у Еўрасаюзе».

Па словах Мілінкевіча, было дамоўлена пра супрацу пасля парламенцкіх выбараў ва Украіне, якія адбудуцца 26 кастрычніка: «Гаворка вядзецца пра разнастайныя супольныя мерапрыемствы, у тым ліку маладзёжныя абмены і культурніцкія праекты».

«Нашы ўкраінскія партнёры шчыра зацікаўленыя ў тым, каб Беларусь абрала еўрапейскі шлях развіцця. Было адзначана, што паспяхова супрацьстаяць расійскай агрэсіі і мацаваць незалежнасць магчыма толькі кансалідацыйнымі высілкамі краін, якія ўваходзяць у праграму "Усходняе партнёрства"», - распавёў лідар Руху «За Свабоду».

Блок Пятра Парашэнкі, з кіраўніком якога Юрыем Луцэнкам сустракаліся лідары Руху «За Свабоду», ёсць фаварытам парламенцкай выбарчай гонкі ва Украіне.

«Нягледзячы на вайну выбары патрэбныя, бо неабходна абнавіць склад парламента. Бо стары, з вялікай колькасцю прадстаўнікоў "Партыі рэгіёнаў" з уласнымі бізнэс-інтарэсамі, блакаваў шэраг важных рашэнняў. А яны патрэбныя дзеля правядзення хуткіх эканамічных рэформаў і барацьбы з карупцыяй». – зазначае Юрась Губарэвіч.

«Палітыкі, з якімі мы гаварылі ў Кіеве, занепакоеныя і іншымі праблемамі: гэта і верагоднае абвастрэнне ваеннага канфлікту, і нарастаючыя энергетычныя складанасці – скарачэнні паставак вуглю і газу, а хутка ацяпляльны сезон», - кажа Юрась Губарэвіч.

Па яго словах, палітсіла дзеючага прэзідэнта Украіны набярэ, паводле сацыялагічных дадзеных, ад 35% да 40%. Пры гэтым у Блоку Парашэнкі не бачаць перашкодаў для супрацы з іншымі рэальнымі, а не папулісцкімі партыямі, якія пройдуць у парламент.

«Камуністы туды, відаць не патрапяць, а Партыя рэгіёнаў удзел браць у выбарах не будзе. Ад яе могуць праз мажарытарныя акругі стаць дэпутатамі дзясятак ці два чалавек, але істотнага ўплыву на дзейнасць Вярхоўнай Рады яны не акажуць». – падсумаваў Губарэвіч.

Газета выдаецца Рухам «За Свабоду». Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна.
Падпісана ў друк 16.10.2014 г. Кантакты рэдакцыі: тэлефон +375 17 2808863, е-пошта info@pyx.by